# РЫТУАЛ «ПЛЯЦЕННЕ ВЕЛЬЦЭ» У ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ БРАГІНСКАГА РАЁНА



**Алена Паўлава,**
навуковы супрацоўнік аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтру даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі

Вясельны абрад – складаная і адначасова ўстойлівая з'ява традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў. У рытуалах і песнях, датычных да гэтага свята, прасочваюцца архаічныя элементы народных вераванняў, звычаяў сямейна-шлюбнай скіраванасці.

У структуры народных традыцый, звязаных з вяселлем, вылучаюцца тры асноўныя перыяды: *давясельны, уласнавясельны і паслявясельны,* на кожным з якіх адбываліся пэўныя рытуальныя дзеянні.

На тэрыторыі Брагінскага раёна ў г.п. Камарын намі зафіксаваны звесткі пра адметны рытуал вясельнага абраду пад назвай «пляценне вельца», якому надаваўся сакральны сэнс. Гэты звычай, які можна аднесці да такога абрадавага этапу, як «зборная субота», вылучаецца сваёй унікальнасцю і мясцовай непаўторнасцю. Адзначым, што ён у асноўным захоўваецца на Палессі і мае таксама падабенства з аналагічнай украінскай вясельнай традыцыяй[1].

Сярод мноства агульных рысаў вылучаецца наступная: калі сяброўкі нявесты рыхтавалі вянкі, то перш чым прыступіць да работы, яны «прасілі ў бацькоў нявесты благаславіць іх вянкі віць» [2]. У апісаннях вясельных традыцый Гомельшчыны сустракаюцца сціплыя звесткі пра «пляценне вельца». Зафіксавана інфармацыя пра тое, што «на Гомельшчыне дзяўчаты *"вілі елку"* – упрыгожвалі каляровымі кветкамі, саламянымі крыжыкамі і г.д. галінку елкі ці вішні» [2].

Паводле ўспамінаў жыхароў г.п. Камарын Брагінскага раёна Гомельскай вобласці, «плесці вельца звычайна пачыналі ў чацвер. Сама назва гэтага рытуальнага дзеяння паходзіць ад дзеяслова "**віць**". З самай раніцы ў лес адпраўлялі жанатых мужчын, якія былі шчаслівы ў шлюбе, дзеля таго, каб вырубіць з пладовага дрэва так званае вельцэ. Дзявочае дрэўца павінна было мець тры галінкі: *"на мужа, на жонку, і штоб прыплод быў"*» (Запісана ад Глувко Тамары Міхайлаўны, 1950 г.н., в. Камарын Брагінскага раёна, Гомельскай вобласці, Паўлавай Аленай у 2013 г.).

Да непасрэднага ўдзелу ў віцці вельца запрашалі абавязкова жанчын замужніх, паспяховых у сямейным жыцці, што з'яўлялася неабходнай умовай і падчас выканання рытуалаў каравайнай абраднасці.

Перад самым пачаткам абрадавых дзеянняў жанчыны прасілі бласлаўлення ў бацькоў нявесты:

– *Ацец і маць, благаславіце вельцэ віць начаць!*
– *Бог блаславіць (3 разы).*

Далей гэты рытуал суправаджаўся выкананнем спецыяльна для яго прызначаных песень:

*Сабраліся жанчыны ціхонечка,*
*У гэты вечар мы песні спяём.*
*Мы пляцем гэта вельцэ для Волечкі,*
*У гэты вечар мы песні пяём.*
*Сабраліся жанчыны ля вогнішча,*

*У гэты вечар мы песні пяём.*
*Наша Волечка будзе прыгожанька,*
*У гэты вечар мы песні пяём.*
*Наша Волечка будзе, як сонейка,*
*У гэты вечар мы песні пяём…*

(Запісана ад Карташ Варвары Мікалаеўны, 1931 г.н., в. Камарын Брагінскага раёна, Гомельскай вобласці, Паўлавай Аленай у 2013 г.).

Як бачым, вобраз нявесты ў прыведзеным песенным тэксце атаясамліваецца з сонейкам, што сімвалізуе пачатак новага этапу ў жыцці дзяўчыны.

Паводле сведчанняў інфарматараў, вельцэ вілі як у хаце жаніха, так і ў хаце нявесты. Злучалі яго пры дапамозе адной ніткі, пры гэтым перавага аддавалася чырвонаму колеру – сімвалу вернасці ў каханні. Упрыгожвалі вельцэ каласамі, галінкамі каліны, рознымі кветкамі, што сімвалізавала багацце, сямейны дабрабыт.

Памер вельца прыблізна дасягаў да 60 сантыметраў. «Калі ўжэ вельцэ было сплецена, то казалі: "*Ацец і маць, прынімайце нашу работу*"» (В.М. Карташ, 1931 г.н.). З успамінаў жыхароў вынікае наступная цікавая інфармацыя: «На канцы кожнага вельца прымотвалі палатно, каб трымаць рукамі, гэта рабілі для таго, каб не забывалі маладыя, што нужно работаць, нада ўчыцца, не забываць ткаць, і гэта быў натуральны лён, каторый нясе здароўе ў сям'ю» (Запі-



сана ад Петрусевіч Тамары Уладзіміраўны, 1955 г.н., в. Камарын Брагінскага раёна, Гомельскай вобласці, Паўлавай Аленай у 2013 г.).

Падрыхтаванае вельцэ ставілі ў каравай, у які папярэдне насыпалі соль. Сам каравай выносілі на рушніку – звычайна гэта рабіла маці кагосьці з маладых – або жаніха, або нявесты – са словамі:

«*Благаславі, Божа, вельцэ маладое, каб жылося маладым добра і шчасліва*».

(Т.У. Петрусевіч, 1955 г.н.).

Абрадавае дрэўца пад назвай «вельцэ» суправаджала маладых на працягу многіх традыцыйных этапаў вяселля. Напрыклад, калі жаніха з нявестай садзілі за стол, то вельцы абодвух ставілі ў чырвоным куце. Першае з іх, згодна з традыцыяй, на другі дзень вяселля нёс хросны бацька маладога, а дру-



гое – хросны бацька маладой. Звычайна прыбіваюць кожнае з іх пры ўваходзе ў будынкі: вельцэ жаніха – над дзвярыма хаты маладога, вельцэ нявесты – над дзвярыма яе жытла.

Але даволі часта гэты абрадавы элемент урачыстасці прыбівалі і ў іншым месцы – над акном. Такім чынам, па наяўнасці вельца ўможна было пазнаць, у якім доме на працягу апошняга часу



стварылася маладая сям'я. Калі, зыходзячы з успамінаў інфарматараў, «сустракаліся на доме два вельца, гэта азначала, што ў гэтай хаце двое дзяцей узялі шлюб» (В.М. Карташ, 1931 г.н.).

Як адзначаюць інфарматары, «калі прыбівалі вельцэ, на канцы прымотвалі бутэльку гарэлкі, лічылася, што яе трэба зняць толькі тады, калі нарадзіцца дзіця ў сям'і; калі ж у маладой пары дзяцей не было, то праз год яе знімалі і выпівалі» (В.М. Карташ, 1931 г.н.).

Засяродзім увагу на тэкстах вясельных песень, якімі суправаджаўся рытуал «пляцення вельца». Вобраз нявесты сімвалічна суадносіцца з вобразамі такіх дрэў, як бярозка, вярба, калінка і інш. Паводле меркаванняў Я. Крука, «бярозка сімвалізавала сабой жаночы пачатак» [3].

*Да белая **бярозка***
*Звілася.*
*З кім наша Ганначка*
*Зляглася?*
*З табою, Іванка,*
*З табою.*
*Пад зялёнаю вярбою.*
*Вараныя конікі*
*Пасучы,*
*Дарагія гасцінцы*
*Даручы…[4].*

У тэкстах вясельных песень, звязаных з рытуалам падрыхтоўкі абрадавага дрэўца, вобраз каліны сімвалізуе маладую, а маладога – вобраз дуба:

*Хораша, хораша, да й на пашы **вярбіна**,*
*Хораша, хораша, да й ў садзе **каліна**,*
*Мы каліну зрубім, за дуб аддадзім,*
*Будзе Вася цалаваць, недацалуецца…*
(В.М. Карташ, 1931 г.н.).

Падчас прыбівання вельцаў выконваліся песні, у якіх цэнтральнае месца адводзілася вобразам-персанажам маладой, маладога, дружак, бацькоў маладых:

*Вось прыбілі мы на хаце,* (2)
*Вельцэ маладое,* (2)
***Маладой і маладому**,* (2)
*Шчасця пажадаем,* (2)
*Каб жылося ім заўсёды*
*Шчаслівa да багата*
(В.М. Карташ, 1931 г.н.).

У такіх песнях бацькі жаніха і нявесты выступалі як добрыя гаспадары, шчодрыя людзі, якія ганарыліся выхаваннем сваіх дзяцей:

***Бацька з маткай** ў рад сядзяць,*
*У рад сядзяць,* (2)
*На Паўлінку ўсё глядзяць.*
*Усё глядзяць.* (2)
*А Паўлінка, дзякуй **бацьку**,*
*Выхавана добра,*
*А Паўлінка, дзякуй **мамцы**,*
*Гаспадыня добра…*
(В.М. Карташ, 1931 г.н.).

Жаніха таксама стараліся паказаць з найлепшага боку. У песні гаворыцца аб тым, што ён мужны, фізічна магутны, добры гаспадар у сваёй хаце:

*Наш Іванька – багатыр,*
*Наш Іванька – гаспадар,*
*Як асілак – мужны,*
*Гаспадар умелы…*
(Т.М. Глувко, 1950 г.н.).

Трэба адзначыць, што не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і ў многіх вёсках Украіны ў мінулыя стагоддзі вясельнае дрэўца маладой аздаблялі галінкамі, кветкамі або чырвонымі ягадамі каліны. Па слушнай заўвазе даследчыцы І.А. Швед, «вільцэ з’яўляецца сімвалам злучэння двух у адно цэлае». Згодна з ёй, дрэўца гэтае мела назву «вільцэ» («гільцэ», «вільцэ», «вілечко»), яго ўпрыгожвалі сяброўкі нявесты і ставілі на святочны стол перад жаніхом і нявестай у дзень вяселля [5].

Фальклорна-этнаграфічныя звесткі пра рытуал «пляценне вельца», якія зафіксаваны на тэрыторыі Брагіншчыны, сведчаць пра ўнікальнасць захаваных у дадзеным рэгіёне абрадавых дзеянняў. Праведзены намі аналіз вобразаў-персанажаў вясельных песень, якія суправаджалі гэтыя дзеянні, сведчыць аб тым, што цэнтральнае месца ў большасці выконваемых твораў заканамерна адводзілася жаніху і нявесце – галоўным удзельнікам вясельнай цырымоніі.

У лакальнай традыцыі беларускай Брагіншчыны выразна прасочвалася сувязь вяселля (як пачатку новага жыцця двух маладых людзей, якое вяло да прадаўжэння роду абодвух) са з’явамі прыроды, у прыватнасці раслінным светам, прадстаўнікі якога сімвалізавалі мужчынскі і жаночы пачатак і вечны рух усяго наперад, яго пастаяннае адраджэнне і бясконцае імкненне да сонца, у будучыню.


**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**

1. Весільні пісні: у 2-х кн. Кн. 1 / упоряд. М.М. Шубравська.– Київ, 1982.
2. Вяселле: Абрад / уклад. К.А. Цвірка, А.С. Фядосік.– Мінск, 1978. С. 19.
3. Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук.– Мінск, 2011. С. 379.
4. Архіў ЦДБКМЛ, філіял ІМЭФ НАН Беларусі, матэрыялы фальклорнай экспедыцыі 1977 г.– Ф.– 8.– воп.– 77.– спр.– 137. С. 36.
5. Швед І.А. «У лузе каліна – усё краса мая…”. Каліна як сімвал усходнеславянскага традыцыйнага фальклору. // Роднае слова. Часопіс. 1998. №3. С. 149–158.